Кацярына Ваданосава

# Міфатворчасць

*Зборнік вершаў*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2017

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
В12

Фота на вокладцы Віталя Курца

**Ваданосава, К.Э.**
В12 Міфатворчасць : зборнік вершаў / Кацярына Ваданосава. — Мінск : А.М. Янушкевіч, 2017. — 96 с.
ISBN 978-985-7165-17-9.

«Міфатворчасць» — першы вершаваны зборнік Кацярыны Ваданосавай. У ім маладая паэтка імкнецца паяднаць рэаліі паўсядзённага жыцця з міфічным светам сваіх вершаваных кроз, перакладаючы музыку душы на музыку паэтычнага гучання...

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7165-17-9**

© Ваданосава К.Э., 2015
© Афармленне.
Выдавец А.М. Янушкевіч, 2017

# ПЕСНІ ЗЯМЛІ

* * *

Мой край легенд, журбы ды песняў –
З табою ўсе мае шляхі...
Незразумелым чарадзействам
Ты апавіты на вякі.

Як свечкі, цэрквы ды касцёлы,
Як скалы, шэрыя муры...
Тут прызямляюцца анёлы,
І папараць цвіце ў бары,

Тут не звяліся ваўкалакі,
У рэчцы крэкча вадзянік,
На вежах зруйнаваных замкаў
Гараць блакітныя агні.

І з белай дамай чорны рыцар
Свой векавы нясуць праклён...
Той край мне вечна будзе сніцца.
Я буду з ім да скону дзён.

*2008*

* * *

Я з табою. Не бойся. Ніколі
Не сыйду па ўсяведнай траве.
Пальцы чэпкім карэннем магнолій
Прарастуць скрозь далоні твае.

Быццам плюшч, што дубы аплятае,
Паглыбляюся ў сэрца да дна
І гляджу, як пад намі, святая,
Пралівае стагоддзі вясна.

Разлятаюся тысячай птушак,
Разрываюся тысячай зор,
Дзікай жарсцю, крывавай і душнай,
Напаўняю маўклівы прастор.

Валасы мае – цёмныя рэкі,
Што бруяцца ля стомленых ног...
Мой вандроўнік, настаўнік ды лекар –
Не злічыць тваіх твараў-дарог.

Я з табою, куды б ні пайшоў ты,
Дзе б ні меў свой прытулак ды хлеб,
Ад слядоў маіх полымем жоўтым
Пры дарогах цвіце кураслеп.

Я з табою. На дзень. На імгненне.
На бясконцую процьму вякоў.
Мы жывыя, каханы. Павер мне.
Мы – зямлі гэтай цела ды кроў.

*2015*

# ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ

Чую аднекуль, нібы здалёк,
Доўгі самотны покліч!
Гэта трубіць старажытны рог,
Гарадь знічкі згаслых вогнішч.

Восеньскі вецер зашуміць,
Зноў ажыве паданне,
І над балотамі праляціць
Дзікае паляванне!

Не пакідаючы слядоў,
Чорныя коні скачуць,
Коні без цугляў і без падкоў,
Ценяў іх не ўбачыць.

А вершнікаў твары схаваны ўначы,
Яны – маўклівыя здані,
Ззяюць смяротным святлом мячы
Дзікага палявання.

Наперадзе постаць мінулых дзён –
Кароль ў залатой кароне,
Не зможа ніколі спыніцца ён
Ў адвечнай сваёй пагоні.

Месяц між хмар і лапы ялін,
Багна пад капытамі...
Сівая легенда глухіх мясцін –
Дзікае паляванне.

Наміткай белай туман ляжыць
Над рэкамі і палямі,
Змрочнай маўклівай хмарай ляціць
Дзікае паляванне.

Вялікага Княства ваяры
За далягляд імкнуцца,
Каб захавалася на зямлі
Легенда аб Беларусі.

*2006*

* * *

Калі ў небе блякне сонца,
і праўда губляе сілу,
Калі я не бачу ззяння
маленькай зоркі сваёй,
Дай, Божа, мне веру ў Слова
ды ўзмах белых моцных крылаў,
Каб болю душа не мела,
каб сэрца знайшло спакой.

Як не застацца ў гэтым храме цішыні
Маўклівай лялькай, безадказна-слушнай
Для брудных рук ды ўсмешак раўнадушных,
Для тых, хто страціў мары, думкі, сны?..

Дазвольце вар'ятам грукаць
у дзверы зямнога Раю –
Для тых, хто дазнаўся праўды,
Рай будзе не на зямлі.
Тыя, хто творыць песні
ды з полымем лёд сплятае,
Ідуць па дарогах свету,
сціраючы мазалі.

Не прадавайце свой святарны дар
За шэры хлеб ды келіх кіслай брагі,
Не прамяняйце годнасць і адвагу
На звон манет, на іх пякельны жар.

Я бачу сваю дарогу –
адбітак суворай сталі,
Я бачу чужое неба
ды шэры зімовы страх...
О, колькі загіне вершаў
ад ганьбы, бяссілля, жалю,
І колькі няспетых песняў
памруць на маіх руках?

Я так змарнела ад руціны ды вайны,
Ад плётак рынкаў, роспачы пагостаў,
Дай, Божа, мне прайсці па свеце проста,
І дай дажыць да подыху вясны...

*2010*

* * *

«Не глядзі, – мне казалі людзі, –
На агні па-над цёмнай багнай,
Не хадзі нацянькі па лузе –
Палявік за сабою сцягне».

Не хацела нікога слухаць
І да рэчкі адна хадзіла,
У балотных люстэрках мутных
Выглядала, каго любіла.

Па дарозе вятры блукаюць,
Б’юцца ў вокны, прытулку просяць,
Мне бяда, а камусьці радасць,
Што за летам настане восень.

Упляла ў валасы рамонкі,
Шархуны на падол нашыла,
У зязюліных слёзах звонкіх
Нечакана душу згубіла.

Заблукала ў высокіх травах,
Не знаходзіла шлях дадому,
А пад вербамі сустракала
Юнака-караля ляснога.

Са смарагдавымі вачыма,
З залатою расой ў далонях,
Яму кланяліся галіны,
Праслаўлялі вятры і зоры.

Не трымайце мяне, сяброўкі, –
Не ўладарка я над сабою:
Толькі ляжа ноч на пагоркі,
Ён чакае па-над ракою.

Сустракае ў высокіх травах
У кароне з лістоў кляновых,
Дорыць смех свой, нібы каралі,
Рассыпае бурштынам словы.

Валасы мае расплятае,
Забірае душу і волю...
Хай ніхто мяне не чакае,
Не вярнуцца мне ўжо ніколі.

*2009*

## РУСАЛКА

...Змеі белыя паўзуць
З-пад маіх змарнелых у дарозе ног...
Птушкамі чырвонымі ўспаміны пралятуць –
Не ўзгадаць мне, колькі ўжо адолена дарог.

Я ўпрыгожу валасы
Попелам халодным з вогнішчаў тваіх...
Адгукнуцца рогатам паўночныя лясы,
Рэха стогалосае твой растрывожа слых.

З попелу мне паўставаць –
Белым дымам над ракой,
Знічкаю барвовай на пажарышчах згасаць,
Ветрам паміраць, і ў смерці здабываць спакой.

У кароне з сон-травы,
У строі з папараці я ў твой дом прыйду:
Заскуголіць нема твой сабака вартавы,
І дажджы атруцяць у калодзежы ваду.

Любы, не пускай мяне,
Не давай мне хлеба ў прагную далонь:
Мой прытулак – пустка, дзе крываўнік заінеў,
Дзе гарыць заклятай кветкай чэрвеньскі агонь.

Пабудзі мяне хутчэй –
Я блукаю ў чорных снах...
Кветкі прарастуць з маіх знясіленых грудзей,
Зоры загарацца ў белых стомленых руках.

*2014*

## БУРШТЫНАВАЕ МОРА

Русалкі ў нетрах пяюць марскіх,
Снуюць іх кросны з марской травой,
Прыспеў нам час выпраўляць ладдзі,
Адлівы клічуць нас за сабой.

Па бурштынавых дарогах,
У паход за невядомым,
Хвалі змыюць з нашых вуснаў зямлі
Пякучы смак.

Строі колеру бурштына
Скінуць бессаромна дрэвы,
Толькі сосны варту вечную нясуць
Па берагах.

З пенай весела, вецер, грай,
З ваўняным ветразя палатном,
І, калі ў зямлі ёсць край,
То там пакінулі мы свой дом.

У русалчыных абдымках
Праляціць імкліва восень,
Сівізна ды соль адбеляць душу
Да чысціні.

І бурштынавае мора
Дасць нам кропелькі спакою,
У халодным краі вечна жывых
Мы спраўдзім сны.

Хвалі цалуюць хмару,
Кормяцца снегападам...
Футры не абароняць
Ад ачышчэння срэбрам...

Толькі вада ды мары,
Вецер у чорных штагах,
Сэрца сівога мора
Б’е па драўляных рэбрах.

*2013*

## ГАВАНЬ ЧАКАННЯ

Заходняга сонца праменні
Цалуюцца з хваляй марской,
І ветразь горда ды смела
Ўздымаецца над галавой.

Твой шлях – гэта штормы ды шквалы,
Твой дах – залаты небасхіл,
Ты мкнешся ў дзівосныя далі,
Якія ніхто не адкрыў.

Твой дом – неабсяжнае мора,
На сушы цябе не ўтрымаць,
Халодная вабіць прастора,
І вены, як рэі, звіняць.

На пошукі Новага свету
Сыходзяць твае караблі...
Пачуй жа, як цёплыя ветры
Мой голас нясуць ад зямлі.

Пад вокліч адчайны чаек
Я веру, ты зможаш згадаць
Свой бераг ды курс да прычала,
Дзе я засталася чакаць,

Пунсова-заходнюю гавань
На ўскрайку знаёмай зямлі,
Дзе я, быццам светлую мару,
Выходжу вітаць караблі.

*2003*

## КЛЯШТАР НАД РАКОЙ

У кляштары белым ніколі званы не зазвоняць,
Ніколі ніхто не пачуе пад вежамі спеў,
Мінаюць вякі, успаміны ў нябыт адыходзяць,
Вецер дыхнуў – і яшчэ адзін год адляцеў.

У парослых травою руінах не чутна маленняў,
Велічных вежаў адбітак у чыстай вадзе,
Нясе свае хвалі рака ў непахісным імкненні,
Каб з памяці сцерці яшчэ адзін ліпеньскі
дзень.

Замест вітражоў – толькі неба ў аконных
вачніцах,
Густыя ўюнкі – габелены на сценах сівых,
Для птушак раздолле ў пустых зруйнаваных
званіцах,
А ўнізе – падлога з высокай зялёнай травы.

Над рэчкаю кляштар стары, здань мінулых
стагоддзяў,
Сведка нямы многіх подзвігаў, войнаў, легенд:
Колькі грымот прагрыміць і дажджоў колькі
пройдзе,
Перш, чым твае камяні спарахнеюць ушчэнт?

Глядзі: пад сцяною тваёй мітуслівыя людзі,
Нібыта за шчасцем, бягуць па жыцці
ўдалячынь,
А шчасце – вось тут. Але хутка цябе ўжо
не будзе,
І толькі рака захавае самотны ўспамін.

*2006*

## БАЛАДА

Ніколі мне не быць з табой,
Не быць тваім жыццём,
Хоць я жыву табой адной,
З адзіным пачуццём.

У пурпуровы аксаміт
Загорнуты твой стан,
Накідка лёгкая, нібы
Над возерам туман.

Няма палацаў у мяне
І залатых манет,
Хаця за твой чароўны смех
Аддаў бы я ўвесь свет.

Усё вазьмі, што маю я -
Мой гонар, меч, жыццё!..
Ды просты што табе ваяр –
Ты прагнеш каралёў.

Каб вольным каршуном я стаў,
Ўзляцеў па-над зямлёй,
То, можа, вецер бы сагнаў
Тугу з душы маёй?..

Каб стаў я чорным крумкачом,
Што трыста год жыве –
Мацней бы з кожным новым днём
Кахаў бы я цябе.

Я бачыў смерць падчас вайны,
Але твой срэбны смех
Больш, чым спічак любой стралы,
Крывавіць сэрца мне.

Трываў я раны, далібог,
Калі ішоў на бой,
А зараз, як нямы халоп,
Стаю перад табой.

А ты смяешся, мой анёл,
Мой кат, маё жыццё...
Хоць я жыву табой адной,
З адзіным пачуццём...

*2010*